Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
______________ А. А. Корбут
«_____»_____________2017 г.
Рэгістрацыйны № ВД-___/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# РЭЖЫСУРА ВІДЭАФІЛЬМА

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-17 01 05-01 Рэжысура свят (народныя)*

2017

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі ОСВО 1-17 01 15-2013 па спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках), вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па напрамку спецыяльнасці 1-17 01 05-01 Рэжысура свят (народныя), рэгістрацыйны № С17-1-39/13 вуч. 27.06.2013


**СКЛАДАЛЬНІК**

*Г. М. Суліма,* выкладчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»


**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*П. У. Іваноў,* дэкан факультэта экранных мастацтваў установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў», дацэнт, прафесар кафедры режысуры кіно і тэлебачання;

*Р. Л. Бузук,* загадчык кафедры тэатральнага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», дацэнт, доктар мастацтвазнаўства

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

кафедрай рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 9 ад 29.04.2016 г.);

навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 10 ад 30.05.2016 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч

Адказны за выпуск: Г. М. Суліма

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Актуальнасць вучэбнай дысцыпліны «Рэжысура відэафільма» абумоўлена вялікімі патрабаваннямі да будучага рэжысёра, неабходнасцю ведання ім спецыфікі сумежных прафесій: рэжысёр святочнай культуры, тэатра, кіно, тэлебачання.

Вучэбная дысцыпліна «Рэжысура відэфільма» звязана з вучэбнымі дысцыплінамі агульнапрафесійнага і спецыяльнага цыклаў: «Асновы рэжысуры і майстэрства акцёра», «Асновы драматургіі і сцэнарнага майстэрства», «Рэжысура свят», «Слоўнае дзеянне ў свяце». Навучанне скіравана на тое, каб студэнт пазнаёміўся з асноўнымі правіламі падрыхтоўчага працэсу здымкі відэа, навучыўся здымаць, манціраваць і агучваць, а таксама прафесійна выкарыстоўваць відэа ў арганізацыі свята, канцэрта, дыпломнага праекта.

Праграма вучэбнай дысцыпліны «Рэжысура відэафільма» прадугледжвае фарміраванне ў будучага спецыяліста ў галіне святочнай культуры акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый:

– умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач;

– валодаць сістэмным і параўнальным аналізам;

– валодаць даследчымі навыкамі;

– умець працаваць самастойна;

– быць здольным параджаць новыя ідэі;

– валодаць міждысцыплінарным падыходам пры рашэнні праблем;

– умець вучыцца, самастойна павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця;

– валодаць метадамі і сродкамі пазнання, навучання, самакантролю для інтэлектуальнага развіцця, павышэння культурнага ўзроўню, прафесійнай кампетэнцыі;

– арганізоўваць работу творчых калектываў падчас правядзення свят для дасягнення пастаўленых мэт і задач;

– карыстацца сучаснымі сродкамі тэлекамунікацый і глабальнымі інфармацыйнымі рэсурсамі;

– праводзіць адбор рэпертуару мастацкіх твораў з мэтай захавання і трансляцыі народнай творчасці;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– распрацоўваць фальклорна-этнаграфічны матэрыял традыцыйных абрадаў і свят, на іх аснове праводзіць рэстаўрацыю, рэканструкцыю і трансфармацыю ў сучасным свяце;

– ажыццяўляць на аснове культурна-гістарычнай спадчыны новыя святочныя формаўтварэнні ў сучасным сацыякультурным асяроддзі.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – сфарміраваць у будучых рэжысёраў свят веды аб мастацтве кінарэжысуры, распавесці пра асаблівасці прафесіі, адкрыць новыя мастацка-выразныя сродкі рэжысуры абрадаў і свят з дапамогай відэафільма.

Дасягненне мэты абумоўлена рашэннем наступных *задач:*

– фарміраванне разумення асаблівасцей прафесіі рэжысуры як самастойнага віду творчасці;

– навучыць выкарыстоўваць відэадакументы ў святочнай культуры;

– аваладанне студэнтам спецыфікі здымкі і мантажу рэпартажу;

– падрыхтоўка да здымачнага працэсу дыпломнага свята;

– навучыць напісанню сцэнарыя да кароткаметражнага, дакументальнага фільмаў;

– уменне працаваць з закадравым тэкстам, запіс закадравага тэксту;

– выхаванне рэжысёрскага мыслення;

– вывучэнне мастацка-выразных сродкаў рэжысуры экраннага мастацтва;

– вывучэнне творчых метадаў вядучых рэжысёраў;

– вывучэнне стыляў і жанраў кіно.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– асноўныя паняцці і тэрміны рэжысуры відэафільма;

– метады кінарэжысуры;

– прынцыпы арганізацыі творчага працэсу здымкі;

– як здымаць і манціраваць невялікія відэасюжэты, рэпартаж, інтэрв'ю;

– як агучваць відэафільм;

– як арганізаваць мантажны працэс відэа.

Павінен *умець:*

– працаваць з метадычнай літаратурай;

– здымаць відэа;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– агучваць відэа;

– манціраваць відэа;

– падрыхтаваць рэпартаж дыпломнага свята.

Неабходна падкрэсліць значнасць агульнапрынятых сучасных педагагічных тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да творчасці і набыцця вопыту:

– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, дэбаты, прэс-канферэнцыі і інш.);

– візуальныя (фота, відэа).

Для грунтоўнага засваення тэарэтычнага матэрыялу, акрамя аўдыторных заняткаў, праграма прадугледжвае самастойную работу студэнтаў: прагляд гульнявога і негульнявога (дакументальнага) кіно; вывучэнне метадычнай літаратуры па стварэнні фільма; знаёмства з вядомымі майстрамі кінарэжысуры, апаратарскага мастацтва, кампазітарамі кіно; наведванне музея гісторыі беларускага кіно; наведванне кінатэатраў і фестываляў кіно.

На вучэбную дысцыпліну «Рэжысура відэафільма» прадугледжана 34 гадзіны аўдыторных заняткаў, з якіх 16 гадзін лекцый, 2 гадзіны семінарскіх і 16 гадзін практычных заняткаў. Форма кантролю ведаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Кіно – спадчыннік усіх відаў мастацтва. Станаўленне кінарэжысуры як прафесіі. Месца кіно сярод іншых відаў мастацтваў: жывапісу, мастацкай фатаграфіі, тэатральнага мастацтва, музыкі, архітэктуры. Мастацка-выразныя магчымасці выяўленчага мастацтва. Сінтэтычнасць мастацтва кіно і яго спецыфіка. Станаўленне кінарэжысуры. Кіно братоў Люм'ер. Майстры кінарэжысуры: С. Эйзенштэйн, Д. Вертаў, А. Даўжэнка, В. Пудоўкін. З'яўленне новых тэхнічных сродкаў у кінаіндустрыі. Камп'ютарная графіка.

### *Тэма 1. Асноўныя функцыі кінарэжысёра*

Рэжысура – прафесія, якая раствараецца ў фільме. Фільм як люстэрка асобы рэжысёра, яго грамадзянская пазіцыя, як маналог, як гутарка з гледачом, як адхіленне, як паэзія. Паэтыка кіно. Рэжысёрская задума. Рэжысёр і матэрыял. Тыпы матэрыялу: літаратурны, фатаграфічны, фільмаграфічны. Аналіз і адбор матэрыялу да фільма. Творчы працэс работы над фільмам. Асістэнт рэжысёра і яго функцыі. Пошук гармоніі ў фільме. Майстры кінарэжысуры.

### *Тэма 2. Эстэтыка кінавыявы*

Элементы візуальнай сферы фільма. Кадр як адзінка кінаапавядання. Кампазіцыя кадра. Колер і святло ў кадры. Фатаграфічнасць кадра. Ракурс. Перспектыва. Хуткасць здымкі і хуткасць малюнка пры дапамозе мантажу. Планы па буйнасці малюнка: агульны, сярэдні, вялікі. Буйнасць планаў па тэорыі Л. Куляшова: дэталь, вялікі план, першы сярэдні план, другі сярэдні план, агульны, далёкі.

### *Тэма 3. Кінасцэнарый*

Літаратурны сцэнарый: тэма, ідэя, сюжэт, мова, стыль, вобразная сістэма і г. д. Экранны (рэжысёрскі) сцэнарый: апісанне таго, што будзе знята і паказана на экране; таго, што знаходзіцца ў кадры. Фабула. Сюжэт. Канфлікт. Раскадроўка. Афармленне сцэнарыя. Кліп. Асаблівасці напісання сцэнарыя для дакументальнага кіно.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 4. Жанр і стыль у кінамастацтве*

Жанры відаў мастацтва (літаратура, тэатр, жывапіс). Жанры кіно. Жанр як трактоўка тэмы і ідэйнай задумы рэжысёра. Жанр як ключ да расказу аб гісторыі фільма. Рэжысура ігравога і неігравога (дакументальнага, навукова-папулярнага, мультыплікацыйнага) кіно. Экранізацыя. Кінаінтэрпрэтацыя іншых відаў мастацтва.

Вызначэнне «стыль» у мастацтве, у кіно. Штамп. Пераймание мастацкіх стыляў у кінарэжысуры. Стыль – крытэрый мастацкай напоўненасці. Стыль – гістарычная катэгорыя. Стыль фільма, рэжысёра, выявы. Стылявыя кірункі, індывідуальны стыль, напластаванне стыляў. Вызначальныя складнікі стылю: кампазіцыя кадра, ракурс, мантажная фраза, тэмпарытм, гук, святло, колер. Рэклама. Абсурд у кіно. Авангард. «Іншае» кіно. Арт-хаус. Г. Франк фільм «Старэй на 10 хвілін», А. Ламарыс «Чырвоны шар», А. Таркоўскі «Каток і скрыпка».

*Тэма 5. Мантажная структура відэафільма*

Вызначэнне «мантаж». Асноўныя прынцыпы мантажу. Мантажная фраза. Глядацкае ўспрыманне. Мантаж як сродак апавядання. Мантаж нямога кіно. Мантаж гукавога кіно. Міжкадравы і ўнутрыкадравы мантаж. Унутрыкадравы канфлікт. Прынцыпы мантажу па тэорыі А. Сакалова: па буйнасці кадраў, па арыентацыі ў прасторы, у напрамку руху аб’екта, па фазе рухаючых у кадры, па кампазіцыі, па колеры і святле. Гармонія і дысгармонія ў мантажнай фразе, кадры. Прынцыпы мантажу монасцэн. Тэмпарытм у мантажы. Паслядоўны і паралельны мантаж. Асацыятыўна-вобразны мантаж. Рэфрэн. Сімволіка колеру. Адвольны мантаж па тэорыі Д. Вертава «Кінавока». Паэтычнае кіно А. Таркоўскага, А. Сакурава.

*Тэма 6. Дакументальнае кіно*

Вызначэнне прафесійнага тэрміна «дакументальнае кіно». Узнікненне, тыпы дакументальнага кіно: кінапубліцыстыка, кінахроніка, даследаванне, навучальны фільм. Творчы працэс стварэння дакументальнага кіно. Выбар тэмы. Герой фільма. Асаблівасці здымкі дакументальнага фільма. Напісанне сцэнарыя. Рэжысура дакументальнага фільма. Кінахроніка і яе выкарыстанне ў нумары, канцэрце, свяце, перформансе, інсталя-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыі. Рэжысёры- дакументалісты: Д. Вертаў, А. Пеляшан, П. Коган, О. Дорман, У. Касакоўскі і інш. Студыя «Летапіс» («Беларусьфільм»). Фільмы «Белвідэацэнтра». Дакументальнае кіно рэжысёраў гульнявога фільма: М. Рома, М. Міхалкова, А. Канчалоўскага, А. Сакурава, А. Іаселіяніі інш.

*Тэма 7. Здымка рэпартажу, інтэрв'ю*

Тэрмін «інтэрв'ю». Навыкі і якасці інтэрв'юера. Віды інтэрв'ю: жорсткае, інфармацыйнае, эмацыянальнае, асабістае, забаўляльнае, апытанні на вуліцы. Тэхналогія інтэрв'ю, падрыхтоўка, неабходныя факты. Асноўныя патрабаванні да вымаўлення. Этапы падрыхтоўкі.

Спецыфіка жанру «рэпартаж». Хронаметраж рэпартажу. Віды рэпартажу: падзейны, пастановачны, праблемны, тэматычна-пазнавальны, актуальны, рэпартаж-расследаванне. Асноўныя патрабаванні: падзейны повад, аўтар-удзельнік падзеі, лаканічнасць, дакладнасць, нагляднасць. Этапы працы над закадравым тэкстам. Агучванне закадравае.

*Тэма 8. Работа кінарэжысёра з творчай групай*

Праца рэжысёра з акцёрам і непрафесійным выканаўцам. Прырода сцэнічнай і экраннай гульні. Выразныя сродкі акцёрскай гульні: гаворка, пластыка, псіхіка, міміка.

Праца рэжысёра з драматургам, сцэнарыстам. Рэжысёр і аператар. Атмасфера фільма. Праца над стварэннем тэмпарытму здымкі. Асаблівасці працы аператара. Вядомыя майстры аператарскага мастацтва: А. Лявіцкі, А. Галаўня, Э. Цісэ, С. Урусеўскі, В. Юсаў, Г. Рэрбер, П. Лебяшаў і інш. Работа з мастаком. Раскадроўка.

Агучванне фільма. Рэжысёр і кампазітар. Драматургія гукавога рада. Спецыфіка мантажнага мыслення. Баланс усіх гукавых сфер фільма. Вядомыя кампазітары кіно: Э. Арцем'еў, А. Зацэпін, А. Рыбнікаў, І. Дунаеўскі, М. Тарывердзіеў, Н. Рота, Э. Марыконэ, С. Губайдуліна, М. Найман і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Колькасць гадзін КРС | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | практычныя заняткі | семінарскія заняткі | | |
| Уводзіны | 2 | 2 | | | | |
| Тэма 1. Асноўныя функцыі кінарэжысёра | 2 | 2 | | | | |
| Тэма 2. Эстэтыка кінавыявы | 2 | 2 | | | | |
| Тэма 3. Кінасцэнарый | 6 | 2 | | | 4 | пісьмовая работа |
| Тэма 4. Жанр і стыль у кінамастацтве | 2 | 2 | | | | |
| Тэма 5. Мантажная структура відэафільма | 6 | 2 | 4 | | | |
| Тэма 6. Дакументальнае кіно | 2 | | | 2 | | |
| Тэма 7. Здымка рэпартажу, інтэрв'ю | 8 | | 4 | | 4 | практ. работа (10 хв.) |
| Тэма 8. Работа кінарэжысёра з творчай групай | 4 | | 4 | | | |
| **Разам…** | **34** | **12** | **12** | **2** | **8** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Арганізацыя кіруемай самастойнай работы студэнтаў

Мэтай кіруемай самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне з'яўляецца павышэнне ўзроўню прафесійнай кампетэнтнасці будучага спецыяліста праз сфарміраванасць дастатковай ступені падрыхтаванасці асобы да самастойнай працы. Гэта мэта дасягаецца праз вырашэнне шэрагу задач: выпрацоўка ў студэнта навыкаў прадуктыўнай дзейнасці, інавацыйна-творчага і культуралагічнага мыслення, пазнавальных здольнасцей; паглыбленае вывучэнне спецдысцыпліны «Рэжысура відэафільма»; актывізацыя самаразвіцця і матывацыі самарэалізацыі студэнта.

Асноўныя формы арганізацыі самастойнай працы студэнтаў:

– падбор і вывучэнне літаратурных крыніц, праца з перыядычным друкам, падрыхтоўка тэматычных аглядаў па перыёдыцы;

– напісанне рэфератаў, аналіз навуковых і навукова-публіцыстычных артыкулаў, асобных публікацый у СМІ;

– падрыхтоўка да ўдзелу ў навукова-практычных канферэнцыях;

– самастойная адпрацоўка практычных навыкаў з выкарыстаннем відэаматэрыялаў.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці рэкамендуецца выкарыстоўваць варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы.

## Сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Для выяўлення ўзроўню вучэбных ведаў і практычных навыкаў студэнта рэкамендуецца выкарыстоўваць дыягнастычны інструментарый, які мае рознаўзроўневы характар. Улічваючы творчы змест дысцыпліны «Рэжысура відэафільма», пажадана выбіраць заданні адкрытай формы са свабодна сканструяваным адказам, праблемныя і творчыя задачы, якія маюць на мэце эўрыстычную дзейнасць і нефармалізаваны адказ.

Сярод метадаў дыягностыкі вылучаюцца наступныя: метады вуснай дыягностыкі (аналіз прагледжаных фільмаў, апытанне, дыспуты); метады практычнай дыягностыкі (маляванне раскадроўкі, здымкі відэа, агучванне відэа, напісанне сцэнарыя на зададзеную тэму: па фота, жывапісе, скульптуры, музычнай кампазіцыі, паэзіі і інш.); метады графічнай дыягностыкі (пісьмовая работа, рэферат па тэме кінамастацтва, жанрах, творчай дзейнасці вядомых майстроў кіно).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Агафонова, Н. А.* Искусство кино: этапы, стили, мастера : учеб. пособие / Н. А. Агафонова ; Мин. обл. ин-т повышения квалификации и переподгот. рук. работников и специалистов образования. – Минск : МОИПКиПРРиСО, 1999. – 87 с.

2. *Зайцева, Л. А.* Выразительные средства кино / Л. А. Зайцева. Нар. ун-т культуры. Фак. литературы и искусства – М. : Знание, 1971. – 160 с.

3. *Мартен, М.* Язык кино / М. Мартен ; пер. с фр., вступ. ст. и общ. ред. С. Юткевича. – М. : Искусство, 1959. – 292 с.

4. *Мельник, Г. С.* Основы творческой деятельности журналиста : учеб. пособие / Г. С. Мельник, К. Е. Виноградова, Р. П. Лисеев. – М. : Флинта : Наука, 2015. – 207 с.

5. *Митта, А. Н.* Кино между адом и раем : кино по Эйзеншнейну, Чехову, Шекспиру, Куросаве, Феллини, Хичкоку, Тарковскому… / А. Н. Митта. – М. : АСТ, 2013. – 489 с.

6. *Норштейн, Ю. Б.* Снег на траве. Фрагменты книги : лекции по искусству анимации : учеб. пособие для студ. вузов / Ю. Б. Норштейн. – М. : ВГИК, 2005. – 247 с.

7. *Самарцев, О. Р.* Творческая деятельность журналиста : очерки теории и практики : учеб. пособие для вузов / О. Р. Самарцев ; под общ. ред. Я. Н. Засурского. – М. : Акад. проект : Гаудеамус, 2009. – 526 с.

8. *Соколов, А. Г.* Монтаж: телевидение, кино, видео=Editing: television, cinema, video : учебник / А. Г. Соколов. – М. : Наука, 2001. – 210 с.

9. *Тарковский, А. А.* Уроки режиссуры : учеб. пособие / А. А. Тарковский ; Всерос. ин-т переподгот. и повышения квалификаци работников кинематографии. – М. : ВИППК, 1993. – 92 с.

10. *Фрейлих, С. И.* Теория кино. От Эйзенштейна до Тарковского : учебник для вузов / С. И. Фрейлих. – М. : Акад. проект : Альма матер, 2005. – 508 с.

11. *Фрумкин, Г. М.* Введение в драматургию телерекламы : учеб. пособие для вузов по специальности 350700 – реклама / Г. М. Фрумкин. – М. : Альма матер : Акад. проект, 2005. – 93 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*12. Фрумкин, Г. М.* Телевизионная режиссура. Введение в профессию : учеб. пособие по курсу «Телевизионная журналистика» / Г. М. Фрумкин. – М. : Акад. проект, 2009. – 136 с.

*13. Юткевич, С. И.* Контрапункт режиссера / С. И. Юткевич. – М. : Искусство, 1960. – 448 с.

*14. Юткевич, С. И.* Поэтика режиссуры / С. И. Юткевич. – М. : Искусство, 1986. – 465 с.

*Дадатковая*

*1. Бюклинг, Л.* Михаил Чехов в западном театре и кино / Л. Бюклинг ; Aleksanteri instituutti. – СПб. : Акад. проект, 2000. – 550 с.

*2. Гордон, А. В*. Не утоливший жажды : об Андрее Тарковском / А. В. Гордон. – М. : Вагриус, 2007. – 382 с.

*3. Гордон, Д. И*. Звезды театра и кино / Д. И. Гордон. – Харьков : Фолио, 2004. – 398 с.

*4. Кожевников, А. Ю*. Крылатые фразы и афоризмы отечественного кино : сборник / А. Ю. Кожевников. – СПб. : Нева, 2004. – 825 с.

*5. Миняев, В. В*. Стивен Спилберг и его мастерская : пер. с нем. / В. Миняев, Ф. Шнелле. – М. : Панорама, 2000. – 348 с.

*6. Михалков-Кончаловский, А. С*. 9 глав о кино и т. д. ... / А. Кончаловский. – М. : Эксмо, 2013. – 175 с.

*7. Ромм, М. И*. Беседы о кинорежиссуре / М. И. Ромм. – М. : Бюро пропаганды сов. киноискусства, 1975. – 287 с.

*8. Ромм, М. И.* Построение киномизансцены : Из стенограмм лекций... / М. И. Ромм. – М. : Всесоюз. гос. ин-т кинематографии. Каф. кинорежиссуры, 1957. – 47 с.

*9. Торсен, Н.* Ларс фон Триер : меланхолия гения: жизнь, фильмы, фобии / Н. Торсен ; пер. с дат. Я. П. Палеховой. – М. : РИПОЛ классик, 2014. – 702 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Спіс фільмаў для прагляду і творчых заданняў

*Гульнявое кіно*

1. А. Таркоўскі «Каток і скрыпка», «Люстэрка»
2. А. Міхалкоў-Канчалоўскі «Хлопчык і голуб»
3. А. Ламарыс «Чырвоны шар»
4. А. Сакураў «Адзінокі голас чалавека»
5. Кінапраект В. Вендэрса «На дзесяць хвілін старэй. Труба», «На дзесяць хвілін старэй. Віяланчэль»
6. Ю. Файт «Трамваі ў іншыя гарады»

*Негульнявое кіно (дакументальнае)*

7. Д. Вертаў «Чалавек з кінаапаратам»
8. Г. Франк «Старэй на дзесяць хвілін», «Чужы боль», «Дыягназ», «Салёны хлеб»
9. А. Пеляшан «Поры года»
10. М. Ром «Звычайны фашызм»
11. А. Сакураў «Маскоўская элегія: Таркоўскія», «Элегія жыцця: Растраповіч, Вішнеўская», «Саната для Гітлера»
12. Н. Міхалкоў «Анна ад 6 да 18»
13. А. Дорман «Падрадкоўнік. Л. Лунгіна»
14. Г. Параджанаў «Я памёр у дзяцінстве. Сяргей Параджанаў»
15. А. Пашкевіч «Мой сябар Атар Іаселіяні»
16. Р. Флаэрці «Чалавек з Арама»
17. П. Коган «Зірніце на твар»
18. Л. Станукінас «Трамвай ідзе па горадзе», «Дырыжырue Юрый Цемірканаў»
19. У. Касакоўскі «Павел і Леля. Іерусалімскі раманс», «Свята», «Цішэй!», «Няхай жывуць антыподы!»
20. М. Вендэ «Палка»

*Негульнявое кіно (мультыплікацыйнае)*

21. Ю. Нарштэйн «Казка казак», «Журавель і чапля», «Вожык у тумане»
22. А. Пятроў «Маё каханне», «Стары і мора», «Сон смешнага чалавека», «Карова», «Русалка»
23. М. Алдашын «Іншы бок», «Раство»
24. К. Бранзіт «Прыбіральная гісторыя»
25. Л. Неувонен «Апошняя вязальшчыца»
26. К. Като «Дом з маленькіх кубікаў»
27. М. Дадок дэ Уіт «Бацька і дачка».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# РЭЖЫСУРА ВІДЭАФІЛЬМА

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-17 01 05-01 Рэжысура свят (народныя)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2017. Фармат 60x84 $^1/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,82. Ул.-выд. арк. 0,48. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ